13. История Украинской ССР: в 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 353–354.
14. Архив ЮЗР. – Т. 1, ч. 3. – С. 49–50; Док. 14. – С. 36–37.
15. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 355.
16. Архив ЮЗР. – Т. 1, ч. 3. – С. 39.
17. *Леп'явко, С.А.* Повстання К. Касінскага (1591–1593 рр.) / С. Леп'явко // Український историчний журнал. – 1994. – № 4.– С. 120–132.
18. *Брехуненко, В.* Дванадцять листів гетьманів Війська Запорозького XVI – першої половини XVII століття з польських рукописних зібрань / В. Брехуненко, М. Нагельський // Український археографічний щорічник. – Київ; Нью-Йорк, 2004. – Вип. 8/9. – Т. 11/12. – С. 440.
19. *Там жа.* – С. 425.
20. *Леп'явко, С.* Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – С. 71–72, 79.
21. *Леп'явко, С.А.* Повстання К. Касінскага (1591–1593 рр.) / С. Леп'явко // Український историчний журнал. – 1994. – № 4.– С. 128–129.
22. *Леп'явко, С.* Козацькі війни кінця XVI ст. в Україні / С. Леп'явко. – Чернігів, 1996. – С. 81–83.
23. История СССР. В 2 т. / под ред. А.Л. Сидорова. – М.: Мысль, 1966. – Т. II. – С. 445.
24. Історія України в документах і матеріалах / від. ред.: С.М. Білоусов. – Київ: Вид-во Акад. наук УРСР, 1941. – Т. 3. – С. 25.
25. Історія українського козацтва: нариси. У 2 т. – Київ: Києво-Могилянська академія, 2006. – Т. 1. – С. 544.
26. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.
27. Listy Stanislawa Zolkiewskiego (1584–1620). – Krak w, 1868. – S. 27; Kronika M. Bielskiego. – T. 3. – S. 1690–1691.
28. История Украинской ССР. В 10 т. / гл. ред.: Ю.Ю. Кондифор. – Киев: Наукова думка, 1982. – Т. 2. – С. 357.

SUMMARY

*In his work the author focuses on a problem of increasing of social and economic oppression of Belarusian and Ukrainian people and antifeudal struggle in the second half of the 16th – the 30th of the 17th centuries and various estimations of this problem.*

*The analysis of the publication of early texts of antifeudal struggle in the second half of the 16th – first thirds of the 17th centuries is made by the author in a convincing, full and objective way.*

Паступіў у рэдакцыю 30.04.2010 г.

---

*УДК 303.446:94(47).072.5*

***І.А. Груцо,***
***кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ***

# СІМВАЛЫ ВОІНСКАЙ ДОБЛЕСЦІ ФРАНЦУЗСКАГА ВОЙСКА Ў ВАЕННАЙ КАМПАНІІ 1812 г. (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ РАСІЙСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ)

Да нашага часу асобныя аспекты франка-рускай вайны 1812 г. з'яўляюцца спрэчнымі і недастаткова даследаванымі. У дадзеным артыкуле мы звернем увагу на лёс палкавых знакаў воінскага доблесці французскага войска падчас адступлення з Масквы. У напалеонаўскай імперыі яны мелі афіцыйную назву «Арлы». Гісторыя Арлоў як дзяржаўнага геральдычнага знака бярэ свой пачатак з мая 1804 г., неўзабаве пасля абвяшчэння Напалеона імператарам [1, с. 1]. За ўзор была ўзята скульптурная выява арла часоў Рымскай імперыі, роўна як і практыка яго выкарыстання ў войсках. У тым жа 1804 г. Арлы былі ўрачыста ўручаныя кожнаму батальёну ў пяхотных і кожнаму эскадрону ў кавалерыйскіх палках французскага войска, а пасля чаго «Арол, і толькі Арол з'яўляўся прадметам салдацкай адданасці» [1, с. 12].

Па сваёй канструкцыі Арол уяўляў сабой сукупнасць трох элементаў: пазалочанае бронзавае навершша ў форме арла, шаўковае палотнішча сцяга і дрэўка. Два апошнія элементы мелі другараднае значэнне, паколькі не з'яўляліся знакамі напалеонаўскай імперыі. Яны выконвалі функцыю пазначэння воінскага падраздзялення на полі бою і іх страта, у адрозненне ад навершша-арла, не наклікала для яго ганьбы.

25 снежня 1811 г. Напалеон падпісаў дэкрэт, закліканы ўзмацніць значэнне Арлоў як знакаў імперыі і воінскай доблесці. З гэтага часу ўводзіліся новыя палотнішчы сцягоў, якія адрозніваліся ад папярэдніх багаццем залатога шыцця і абавязковым малюнкам нумара палка з пералікам пераможных бітваў, у якіх ён прымаў удзел, а таксама геральдычных знакаў імперыі: кароны, лацінскай літары N і арла [2, с. 26]. Навершша-арол засталося мадэлі 1804 г. і ў войсках, паводле традыцыі, якая ўжо склалася, па-ранейшаму лічылася галоўным элементам Арла. Іх колькасць яшчэ ў лістападзе 1811 г. была скарочана да аднаго на полк, а ўсе астатнія падлягалі здачы на захаванне.

Падчас ваеннай кампаніі 1812 г. французскія палкі Вялікага войска страцілі частку сваіх Арлоў. Лічылася, што «варожыя сцягі з'яўляюцца найгалоўнейшым набыткам славы нашых (расійскіх. – *І.Г.*) воінаў» [3, с. XI], таму гэты факт не мог быць праігнараваны прадстаўнікамі дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі.

У 1813 г. палкоўнік рускага войска П.А. Чуйкевіч, кіраўнік Асобай канцыляры – вышэйшага органа расійскай ваеннай разведкі, апублікаваў працу «Разважанні аб вайне 1812 года» [4]. У ёй упершыню была абагульненая разнастайная інфармацыя аб трафеях мінулай кампаніі.

Паводле падлікаў П.А. Чуйкевіча, з 27 чэрвеня па 31 снежня рускімі войскамі было захоплена 75 сцягоў Вялікага войска [5, с. 1–11]. Аднак ён не паказаў іх прыналежнасці да пэўных падраздзяленняў, без чаго немагчыма ўстанавіць, ці знаходзіліся ў ліку гэтых ганаровых трафеяў Арлы французскіх палкоў. Тая акалічнасць, што трафейныя воінскія рэліквіі носяць у працы П.А. Чуйкевіча абагульненую назву «сцягі», не дазваляе вызначыць, былі яны палкавыя, батальённыя, эскадронныя або ж з'яўляліся проста значкамі, якія нагадваюць знешнім выглядам сцягі.

З улікам выказаных заўваг уяўляецца, што зробленая П.А. Чуйкевічам праца насіла не навуковы, які прадугледжвае глыбокі аналіз мінулых падзей, а прапагандысцкі характар. Ва ўмовах ваеннага супрацьстаяння Расіі і напалеонаўскай Францыі такі падыход быў мэтазгодны, але меў мала агульнага з гістарычным даследаваннем.

У чарговы раз пытанне аб лёсе сцягоў Вялікага войска было паднята ў 1839 г. у працы вайскоўца-гісторыка А.І. Міхайлоўскага-Данілеўскага «Апісанне Айчыннай вайны 1812 года». Так, падводзячы вынікі Таруцінскай бітвы, ён згадвае ў ліку захопленых трафеяў «адзін сцяг», але не прыводзіць ніякіх тлумачэнняў ні па акалічнасцях яго захопу, ні па прыналежнасці да пэўнай воінскай часці [6, с. 243]. Сапраўды, такі ж падыход – канстатацыя самога факта захопу непрыяцельскага сцяга без якіх-небудзь аўтарскіх каментарыяў – утрымліваецца і ў апісанні бою пры Калоцкім манастыры [6, с. 342].

Пры апісанні бітвы пад Вязьмай, А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі адыходзіць ад пазіцыі непрадузятага назіральніка і прызнае, што перамогі рускіх войскаў не пацвярджаюцца захопам у вялікіх колькасцях сцягоў непрыяцеля. Не абмяжоўваючыся проста канстатацыяй дадзенага факта, ён, спасылаючыся на сведчанне галоўнага хірурга 3-га вюртэмбергскага коннаегерскага палка Роса, тлумачыць яго тым, што «шматлікія палкавыя начальнікі загадалі (пасля скарачэння па прычыне страт колькасці батальёнаў у палках. – *І.Г.*) астатнія сцягі здымаць з дрэўкаў і хаваць у ранцы і пад мундзіры салдат». Па меркаванні А.І. Міхайлоўскага-Данілеўскага, «вось адна з прычын, чаму ў Айчынную вайну няшмат было ўзята непрыяцельскіх сцягоў і штандараў, бо людзі, якім яны былі даручаны, загінулі разам з імі» [6, с. 355].

У дадзеным выпадку выклікае нязгоду тая акалічнасць, што практыку захавання знакаў воінскай доблесці ў саюзных войсках напалеонаўскай Францыі, аўтар без якіх-небудзь на тое падстаў распаўсюджвае і на французскія палкі Вялікага войска.

У далейшым выкладзе А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі працягвае займаць пазіцыю назіральніка, выбарачна згадваючы аб захопе непрыяцельскіх сцягоў. Напрыклад, апісваючы пачатак знакамітай бітвы пад Красным – атаку 5 лістапада каля вёскі Еськава атрада пад камандаваннем генерала Міларадавіча на калону войскаў І корпуса маршала Даву, ён згадвае аб захопе аднаго сцяга [7, с. 12]. Затым гаворыць аб тым, што захапілі ў гэты ж дзень «3 сцягі і 3 штандары» [7, с. 18]. У выніковым жа падліку трафеяў, захопленых за ўвесь час бітвы пры Красным з 3 па 6 лістапада, аб сцягах размовы наогул няма [7, с. 28]. Няма таксама ніякай інфармацыі і аб іх прыналежнасці да пэўных воінскіх часцей Вялікага войска, хоць дастаткова маляўніча апісваецца эпізод, калі М.І. Кутузаў дэманструе гвардзейскім часцям рускага войска захопленыя «французскія Арлы», гаворачы пры гэтым: «Як іх небарак шкада! Яны і галоўкі павесілі; бо ім халодна і галодна» [7, с. 31].

Зноў да лёсу сцягоў Вялікага войска А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі звяртаецца пры апісанні яго адступлення на ўчастку паміж мястэчкамі Талачын і Бабёр. Жадаючы падкрэсліць складанасць сітуацыі, у якой апынуўся імператар і яго войска, ён выкарыстоўвае ўрывак з мемуараў графа Сегюра, які займаў у 1812 г. пасаду галоўнага кватар'ера Галоўнай кватэры Напалеона і сцвярджаў, што імператар «загадаў прынесці да сабе Арлы ўсіх карпусоў і спаліў іх» [7, с. 138]. Ніякага аналізу дакладнасці дадзенага сцвярджэння А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі не праводзіць і абмяжоўваецца яго канстатацыяй.

Такія адносіны да версіі Сегюра можна растлумачыць толькі тым, што яна яго цалкам задавальняла, дазваляючы не адцягваць увагу для тлумачэння ўжо адзначанага раней факта нязначнай колькасці сцягоў, захопленых рускімі войскамі. Як вынік, А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі абыходзіць маўчаннем пытанне аб лёсе сцягоў Вялікага войска ў бітве на рацэ Бярэзіне (якія сцягі? яны былі спаленыя ў Бабры напярэдадні пераправы. – *І.Г.*). Праўда, пры апісанні праследавання непрыяцеля на ўчастку ад Маладзечна да Смаргоні, ён, гаворачы аб захопленых рускімі войскамі трафеях, згадвае «сцягі і штандары», але не упамінае аб іх колькасці, акалічнасцях захопу і прыналежнасці да пэўных воінскіх частак [7, с. 226].

Наступны сюжэт, які мае дачыненне да лёсу сцягоў Вялікага войска, звязаны ў працы А.І. Міхайлоўскага-Данілеўскага з апісаннем завяршэння ваеннай кампаніі 1812 г. Характарызуючы цяжкі стан Вялікага войска, ён выкарыстоўвае даныя рапарта маршала Бярцье маршалу Мюрату аб стане і колькасці войскаў, якія пакідалі межы Расійскай імперыі. У рапарце гаварылася, што «пры невялікай колькасці пакінутых сцягоў цягнуліся толькі па некалькі афіцэраў і унтэр-афіцэраў» [7, с. 264]. Сцвярджэнне маршала Францыі Бярцье аб захаванні да канца ваеннай кампаніі 1812 г. «невялікай колькасці сцягоў» відавочна супярэчыць версіі графа Сегюра аб тым, што «Арлы ўсіх карпусоў» былі спалены па загадзе Напалеона на ўчастку адступленння паміж Талачынам і Баб-

ром. Аднак А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі вырашыў не акцэнтаваць увагу на гэтай супярэчнасці, паколькі для яго тлумачэння патрабавалася праводзіць спецыяльнае даследаванне, якое выходзіла за межы апісання асноўных падзей Айчыннай вайны 1812 г.

Пры падвядзенні вынікаў ваеннай кампаніі А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі гаворыць аб тым, што трафеямі рускіх войскаў стала «да 100 сцягоў і штандараў» [7, с. 310]. На жаль, прыведзеныя ім раней у тэксце звесткі аб колькасці захопленых сцягоў не дазваляюць лічыць абгрунтаванай прыведзеную лічбу.

Апошнім эпізодам, у якім А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі звяртаецца да трафейных сцягоў, з'яўляецца дадзены М.І. Кутузавым у Вільні ў гонар прыезду Аляксандра І баль. Да ног імператара былі пакладзены непрыяцельскія сцягі, якія фельдмаршал «атрымаў за паўгадзіны перад тым ад графа Платава» [7, с. 314]. Вельмі эфектная канцоўка вайны, якая пераканаўча сведчыць аб поўным разгроме ворага! Трохі яе змазвае тая акалічнасць, што непрыяцельскія сцягі абязлічаны, гэта значыць цалкам не ясна, яны сапраўды з'яўляліся знакамі воінскага доблесці палкоў розных кантынгентаў Вялікага войска, у тым ліку Арламі французскіх палкоў, або простымі сцягамі, значкамі і вымпеламі ад горнаў.

На працягу 1859–1860 гг. у свет выйшла трохтомнае даследаванне вайскоўца-гісторыка генерал-лейтэнанта М.І. Багдановіча «Гісторыя Айчыннай вайны 1812 года па дакладных крыніцах». Аналізуючы вынікі бітвы пры Малаяраслаўцы, ён піша: «Казакі захапілі ў Гродне парк гвардзейскай артылерыі і адбілі сцяг» [8, с. 42]. Нягледзячы на тое, што пры гэтым М.І. Багдановіч спасылаецца на першакрыніцы («Журнал ваенных дзеянняў», мемуары генерала Ярмолава і французскага ваеннага гісторыка Шамбрэ), з прыведзенага ўрыўка нельга ўстанавіць, якой воінскай часці належаў гэты сцяг і акалічнасці яго захопу. Відавочна, у выкарыстаных ім крыніцах на гэты конт ніякай інфармацыі не ўтрымлівалася, а праводзіць дадатковае даследаванне па дадзеным эпізодзе М.І. Багдановіч не палічыў неабходным з прычыны нязначнасці на фоне грандыёзных падзей вайны 1812 г.

Там жа, дзе база крыніц дазваляла, М.І. Багдановіч вельмі дакладны. Напрыклад, апісваючы бітвы пры Красным, ён паказвае, што палкоўнік Давыдаў і Маскоўскі драгунскі полк у якасці трафея захапілі Арол 35-га палка лінейнай пяхоты французскага войска [8, с. 118]. У той жа бітве гвардзейскія ўланы атакавалі 18-ы лінейны пяхотны полк, які «страціў Арла» [8, с. 137]. Такім чынам, упершыню ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі быў усталяваны і апублікаваны факт захопу Арлоў пэўных пяхотных палкоў французскага войска.

Пра апісанні далейшага адступлення Вялікага войска М.І. Багдановіч згадвае аб захопе «Арла» і двух сцягоў у бітве за Барысаў, а таксама двух сцягоў пры разгроме 12-й дывізіі Партуно на левым беразе Бярэзіны [8, с. 235, 293]. Гаворачы аб трафеях, захопленых рускімі войскамі ў баі пры вёсцы Лацігаль, ужо пасля пераправы праз р. Бярэзіну, ён называе ў іх ліку «2 штандары» і дадае важную дэталь «на адным з якіх была надпіс «Аўстэрліц, Эйлаў, Ваграм» [8, с. 302]. Высветліўшы, які з палкоў французскага войска адзначыўся ў згаданых бітвах, не складала праблемы ўстанавіць яго нумар, але М.І. Багдановіч не палічыў неабходным праводзіць якія-небудзь дадатковыя даследаванні.

Не абышоў ён увагай эпізод знішчэння сцягоў усіх карпусоў Вялікага войска. Яго папярэднік А.І. Міхайлоўскі-Данілеўскі сцвярджаў, што гэта падзея адбылася на пераходзе паміж Талачынам і Бабром. М.І. Багдановіч, спаслаўшыся на звесткі французскага вайскоўца гісторыка Шамбрэ і мемуары графа Сегюра, запісаў: «Па прыбыцці ў Бабёр Напалеон загадаў прынесці да сябе Арлы ўсіх палкоў і спаліць іх» [8, с. 251]. Характэрна, што ён не падвяргае крытыцы даныя свайго папярэдніка А.І. Міхайлоўскага-Данілеўскага і не імкнецца даказаць дакладнасць звестак, на якія спасылаецца ў сваёй працы па гэтым эпізодзе. Для яго не мае прынцыповага значэння, у якім месцы адбылася гэта знакавая падзея ў лёсе Арлоў, а таму яна і не заслужыла асаблівага каментарыя з яго боку.

Сапраўды, таксама без каментарыя, але са спасылкай на мемуары камандзіра 4-га палка лінейнай пяхоты Р.Э.Ж. Мантэск'е-Фезенсака, ён запісвае: «На апошнім пераходзе да Маладзечна Напалеон аддаў загад зламаць Арлы і дрэўкі сцягоў і закапаць іх» [8, с. 304]. На той факт, што прыведзеныя даныя супярэчаць раней выкарыстаным звесткам Шамбрэ і Сегюра аб спаленні Арлоў у Бабры, а значыць, патрабуюць аналізу і тлумачэння, М.І. Багдановіч увагі не звяртае, пакідаючы пошукі ісціны ў дадзеным пытанні нашчадкам.

Да канца XIX ст. цікавасць да лёсу воінскіх рэліквій напалеонаўскай Францыі ў ваеннай кампаніі 1812 г. набывае ўстойлівы характар, што знаходзіць сваё пацвярджэнне ў розных публікацыях. Так, гісторык К.К. Случэўскі засведчыў, што ў храме маёнтка графа Аракчэева Грузіна ў Наўгародскай губерні знаходзяцца чатыры сцягі напалеонаўскай гвардыі і чатыры штандары італьянскіх войскаў» [9, с. 12]. Якім чынам сцягі Вялікага войска апынуліся ў гэтым маёнтку, ён не тлумачыць.

У 1901 г. гісторык А. Гекель апублікаваў кароткі каментарый да малюнка мастака С. Іванова, які адлюстраваў сцяну Казанскага сабора ў Санкт-Пецярбургу з прымацаванымі да яе калон трафейнымі сцягамі ваеннай кампаніі 1812 і збольшага 1813 і 1814 гадоў. Усяго ў саборы іх захоўвалася 115, у тым ліку 49 французскіх «Арлоў, сцягоў і штандараў», 6 – італьянскіх, 11 – польскіх, 44 – германскіх (саксон-

скіх, баварскіх, вестфальскіх і рэйнскага саюза) [10, с. 317, 318]. З агульнай колькасці трафейных воінскіх рэліквій А. Гекель апісаў і ідэнтыфікаваў семнаццаць – толькі тых, якія былі адлюстраваны на малюнку С. Іванова. Яго заслугай з'яўляецца таксама спроба ўсталяваць іх прыналежнасць да пэўных палкоў французскага войска.

У 1903 г. у часопісе «Русская старина» была змешчана інфармацыя аб палотнішчы сцяга Арла 127-га палка лінейнай пяхоты французскага войска. У бітве пад Красным яго захапіў казачы ўраднік Ілья Безмалітвін і «па багацці ўпрыгожванняў» пакінуў у сябе. У 1826 г. ён быў затрыманы пры продажы палотнішча сцяга ў Нахічэвані за 115 рублёў. Звяртае на сябе ўвагу тое, што аб гэтым кур'ёзным выпадку тут жа быў пастаўлены ў вядомасць імператар Мікалай I, які аддаў загад неадкладна даставіць сцяг у Санкт-Пецярбург [11, с. 316]. Дадзены факт сведчыць, што лёс Арлоў французскага войска пастаянна знаходзіўся ў цэнтры ўвагі вышэйшых службовых асоб Расійскай імперыі.

Тым не менш у расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі спецыяльныя даследаванні па дадзенай праблеме адсутнічаюць, а адпаведныя сюжэты, калі і з'яўляліся ў працах па гісторыі франка-рускай вайны 1812 г., то толькі ў якасці дапаможнага ілюстрацыйнага матэрыялу. Прыкладам таму служыць шматтомная праца гісторыка П.А. Ніве «Айчынная вайна», дзе сюжэт аб лёсе сцягоў Вялікага войска праходзіць «чырвонай стужкай» [12]. Дадзеная праца прэтэндуе на поўнае і ўсёабдымнае асвятленне яе падзей, пабудавана на выкарыстанні назапашаных у гістарыяграфіі звестак, а таксама сведчанняў непасрэдных удзельнікаў ваеннай кампаніі 1812 г. Зрэшты, нешматлікасць спасылак на гэтыя крыніцы, не дазваляе лічыць працу П.А. Ніве навуковым даследаваннем, у якім утрымліваюцца якія-небудзь новыя даныя па праблеме лёсу сімвалаў воінскай доблесці французскага войска або падыходы да яе рашэння.

Падводзячы вынік асвятленню ў дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі пытання лёсу Арлоў пяхотных і кавалерыйскіх палкоў французскага войска ў ваеннай кампаніі 1812 г., можна канстатаваць адсутнасць у яе прадстаўнікоў сістэмнага падыходу, накіраванага на асэнсаванне ўсяго комплексу назапашаных па дадзенай праблеме звестак. Як вынік, у іх працах сюжэты, звязаныя з захопам Арлоў, выкарыстоўваліся толькі ў якасці ілюстрацыйнага матэрыялу, закліканага выступаць ускоснымі доказамі перамогі рускіх войскаў як у канкрэтных бітвах, так і ў ваеннай кампаніі 1812 г. у цэлым.

Прызнаючы нешматлікасць сярод трафейных знакаў воінскага доблесці Вялікага войска Арлоў яго французскіх палкоў, прадстаўнікі дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі давалі неперăканаўчае тлумачэнне дадзенаму факту або, у большасці сваёй, наогул яго ігнаравалі. Гэта можна растлумачыць тым, што перамога над сапернікам традыцыйна даказваецца публічнай дэманстрацыяй сімвалаў воінскай доблесці яго разгромленых палкоў. Тая невялікая колькасць трафейных Арлоў французскага войска, якая захоўвалася ў якасці ганаровых трафеяў у Казанскім саборы Санкт-Пецярбурга, не магла служыць пераканаўчым відавочным доказам перамогі над ім. Высвятленне ж лёсу астатніх палкавых знакаў воінскага доблесці французскага войска патрабавала правядзення карпатлівых даследаванняў і, перш за ўсё, прызнання і публічнага абвяшчэння таго факта, што не ўсе яны сталі трафеямі рускіх войскаў. Паколькі французскія палкі складалі касцяк Вялікага войска, такое прызнанне немінуча ўступала ў супярэчнасць з усталяваўшымся ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі становішчам аб безумоўнай перамозе рускай зброі ў Айчыннай вайне 1812 г. Напярэдадні яе стогадовага юбілею любыя даследаванні ў дадзеным кірунку былі, безумоўна, непажаданыя і таму не праводзіліся. Першая сусветная вайна, а затым рэвалюцыя і Грамадзянская вайна спынілі на пэўны перыяд вывучэнне праблемы лёсу воінскіх рэліквій французскага войска ў ваеннай кампаніі 1812 г.

Літаратура і крыніцы


1. *Fraser, E.* The war drama of the Eagles / Edward Fraser. – London, John Murray, Albemarle street, W., 1912. – 442 p.
2. *Hollander, O.* Les drapeau et etendards de 1812 a 1815 / O. Hollander. – Paris-Nancy, 1902. – 238 p.
3. Записки разряда военной археологии и историографии императорского русского военно-исторического общества под редакцией действительного члена Н.И. Веселовского. – Петроград: Тип. Главного Управления Уделов. Моховая, 40. – 1914. – Т. 3. – 266 с.
4. *Чуйкевіч, П.А.* Рассуждения о войне 1812 года / П.А. Чуйкевіч. – СПб.: Печатано при Сенатской Типографии, 1813. – 136 с.
5. *Bertin, G.* La 8hampagne de 1812 / G. Bertin. – Paris, Flammarion. – 432 p.
6. Описание Отечественной войны 1812 г. по высочайшему повелению сочиненное генерал-лейтенантом Михайловским-Данилевским. – СПб.: Типография Штаба Отдельного Корпуса Внутренней Стражи, 1845. – Издание третье. – Часть третья. – 404 с.
7. Описание Отечественной войны 1812 г. по высочайшему повелению сочиненное генерал-лейтенантом Михайловским-Данилевским. – СПб.: Типография Штаба Отдельного Корпуса Внутренней Стражи, 1843. – Изд. 3. – Ч. 4. – 368 с.
8. *Богданович, М.* История Отечественной войны 1812 года по достоверным источникам / М. Богданович. – СПб.: Типография Торгового дома С. Струговщикова, Г. Похитонова, Н. Водова и К, 1860. – Т. III. – 541 с.
9. *Случевский, К.К.* По северо-западу России / К.К. Случевский. – СПб.: Изд-во А.Ф. Маркса, 1897. – Т. I. «По Северу России». – 456 с.
10. *Гекель, А.* Трофеи хранящиеся в Казанском соборе / А. Гекель // Разведчикъ. – 1901. – № 546 – С. 317–318.
11. Русская старина. Т. CXVI. Ноябрь.
12. *Ниве, П.А.* Отечественная война / П.А. Ниве. – СПб., Изд-во В.К. Ильинчика, 1911–1912. – Т. 1–5.



Summary

*The problem of studying a lot of the regimental military honour symbols of the French Army in the 1812 campaign in the pre-revolutionary Russian historiography is analyzed in the article.*


Паступіў у рэдакцыю 01.02.2010 г.